***Сігай Н.А.***
***УА МДПУ імя Шамякіна***
***г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь***

**ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОГА МАСТАЦТВА**

У сучаснай сацыякультурнай сітуацыі асаблівую актуальнасць набывае тэндэнцыя да развіцця нацыянальна-культурнай і эканамічнай рэгіяналізацыі як спосаб захавання самабытнасці кожнага этнасу. Такая акалічнасць і ў выхаваўчай справе абавязвае звярнуць увагу на беларускую народную культуру, неад'емнай часткай якой з'яўляецца дэкаратыўна-прыкладное мастацтва з выразна этнічнай адметнасцю. Аналізуючы выхаваўчы патэнцыял дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў народнай педагогіцы беларусаў, можна адзначыць наступнае.

Далучэнне да твораў, знаёмства з матэрыялам, з якога яны ў народна-выхаваўчай практыцы вырабляюцца, засваенне першых вытворчых аперацый у народна-выхаваўчай практыцы адбывалася вельмі рана і садзейнічала фарміраванню і развіццю зрокавых, сенсарных і тактыльных аналізатараў, дазваляла ўдасканаліць зрокава-маторную каардынацыю рухаў. Пры развіцці аналізатараў ішло інтэнсіўнае развіццё мовы, разумовых здольнасцей. Розныя віды матэрыялаў, розны падыход да яго апрацоўкі фарміравалі кемлівасць, вынаходлівасць, творчыя здольнасці дзіцяці.

Працэс стварэння твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ажыццяўляўся ў сям'і для яе патрэб, гэта вяло да добрага ведання ўсіх вытворчых аперацый, разумення іх неабходнасці, павышала матывацыю дзіцяці да авалодвання пэўным рамяством, фарміравала настойлівасць, працавітасць.

Этнічная скіраванасць дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва знаёміла дзіця з асаблівасцямі народнага ладу жыцця, светапоглядам беларускага народа, скіроўвала і фарміравала яго маральна-этычныя і сацыяльна-эстэтычныя ідэалы.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва дазваляла асэнсаваць сябе як частку народа са старажытнай культурай, набыць упэўненасць у сваёй значымасці як прадстаўніка гэтага народа, вяло да фарміравання годнасці, патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці.

Такім чынам, можна адзначыць, што дэкаратыўна-прыкладное мастацтва з'яўляецца адным з найважнейшых сродкаў уздзеяння на развіццё асобы. Выхаваўчы патэнцыял дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва вельмі значны, дасканала не вывучаны і ўяўляе вялікую цікавасць для навукоўцаў. Акрамя таго, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва з паспяховасцю выкарыстоўвацца ў наш час не толькі ва ўстановах агульнай і дадатковай адукацыі, але і ў сямейным выхаванні.

[1] "



МГПУ им. И.П.Шамякина